# Менскія гандлёвыя рады

Упершыню раскопкі разбуранай часткі менскіх гандлёвых радоў былі распачаты ў чэрвені 1979 г. Тады былі закладзены чатыры раскопы, у якіх былі даследаваны два падвальных памяшканні цалкам і частка яшчэ аднаго памяшкання. Былі прасочаны і рэшткі мураванай агароджы канца ХУП ст. вакол кляштара бернардынцаў.

Пазней даследаванні гандлёвых радоў былі працягнуты В.Собалем у 1990 г. Археолаг прасачыў сцены і падмуркі гандлёвых радоў і высветліў, што ў сярэдзіне — другой палове XIX ст. да іх была зроблена прыбудова.

У ліпені—жніўні 1993 г. раскопкі гандлёвых радоў былі завершаны. Пад іх падмуркамі быў прасочаны слуп ад цаглянай агароджы ХУП ст.

У выніку шматгадовых даследаванняў высветлена, як паступова змянялася тая частка Верхняга горада Менска, дзе зараз знаходзяцца гандлёвыя рады. Людзі ўпершыню з'явіліся тут у пачатку бягучага тысячагоддзя, аб чым сведчаць знаходкі ў ніжніх слаях культурнага слоя шматлікай керамікі XI—XIII стст. Галоўным чынам гэта гаршкі. Усе яны зроблены на ручным ганчарным коле, фармаваныя з грубага цеста з вялікай колькасцю жарствы. Некаторыя арнаментаваныя радамі хваляў ці шматрадным лінейным арнаментам. Па прафіліроўцы сасуды падобныя да аналагічных знаходак з менскага замчышча, гарадзішча на Менцы, Заслаўя. У самых ранніх пластах на месцы гандлёвых радоў знойдзена таксама шыфернае праселка XII ст.

Сярод знаходак, якія адносяцца да XIV і наступных стагоддзяў, пераважае таксама посуд: гаршкі, кубачкі, талеркі, міскі, рынкі, скарбонкі зялёнага і зеленавата-карычневага колераў. Сустракаюцца і паўмаёлікавыя сасуды, што ўпрыгожаны каляровым роспісам па ангобе пад паліву. Сярод іншых катэгорый матэрыялу найбольш цікавыя наступныя: нешматлікія фрагменты пячной кафлі з маскаронамі, трохшыпныя падкоўкі на абцас, трубчаты ключ ад замка ХУП ст.

У дваццатых гадах ХУII ст. у гэтай частцы горада будуецца комплекс мужчынскага бернардынскага кляштара. Пасля пабудовы касцёла тут узнікае могільнік, які функцыянуе да канца ХУIII ст.

У час археалагічных даследаванняў 1979 г. у раскопах I і III былі прасочаны рэшткі мураванай агароджы, якая калісьці аддзяляла кляштар ад горада. У першым раскопе яна падыходзіць да мура гандлёвых радоў на адлегласць 1,2 м, а ў трэцім — на адлегласць да 4 м. Агароджа паказана на плане 1801 г.

Зроблена агароджа з добра абпаленай цэглы-пальчаткі ў тэхніцы рад лажкоў — рад тычкоў. Памеры цэглы 27-29 х 13-15 х 5-5,5 см. Падмурак агароджы зроблены цалкам з цэглы і заглыбляецца ў мацерык на 0,6 м. Рэшткі сцяны, што прасочаны ў 1990 г., складзены таксама з цэглы-пальчаткі. Яе верхняя адзнака зафіксавана на глыбіні 2,3 м ад сучаснай дзённай паверхні. Вышыня захаваўшайся часткі сцяны складае 0,3 м. У раскопках 1993 года рэшткі агароджы XVII выяўлены ў выглядзе квадратнага слупа, што быў уключаны ў падмурак пад заходняй сцяной будынка гандлёвых радоў. Слуп змураваны з цэглы-пальчаткі памерамі 5-5,5 х 11-12 х 28-29 см. Сістэма муроўкі наступная: рад лажкоў — лажок, тры тычкі, палова тычка, лажок...— рад лажкоў. Цэгла чырвонага колеру, добрай якасці. Падмурак слупа цалкам складзены з цэглы і заглыблены ў мацерык на 0,5-0,55 м. Па памерах цэглы і тэхніцы муроўкі яе з"яўленне можна датаваць 70-90-мі гадамі ХУII ст.

Большасць гісторыкаў лічаць, што гандлёвыя рады пабудаваны ў першай палове XIX ст., бо на планах гэтай часткі Менска за 1801 і 1806 гг. гэтага будынка няма. Ён з"яўляецца толькі на планах 1817 г.

Аналіз будаўнічых матэрыялаў можа ў пэўнай ступені пацвердзіць такое меркаванне, але аўтары выказваюць адносна часу пабудовы



*Менскія гандлёвыя рады на пачатку XX ст.*

гандлёвых радоў і асабістую думку. Справа ў тым, што першапачаткова будынак, а дакладней яго сутарэнні, зроблены з цэглы-пальчаткі памерам 26-27 x 13,5 x 5-5,5 см. З такой цэглы зроблены пазней знішчаныя скляпенні падвалаў.

Вядома і тое, што цэгла-пальчатка знікла ў асноўным на тэрыторыі Беларусі недзе ў 80-я гады XVIII ст. Таму ніводнага будынка пачатку XIX ст., змураванага з цэглы-пальчаткі, няма. На падставе сказанага можна дапусціць два меркаванніі:

а) сутарэнні былі пабудаваны яшчэ ў канцы XVIII ст., але сам будынак гандлёвых радоў, ці можа пабудова іншага прызначэння, быў драўляным і меў толькі мураваныя падвалы. На мяжы XVIII і XIX стст. ён мог згарэць і таму яго няма на вышэй адзначаных планах. У раскопе II у сярэдзіне памяшкання на значнай глыбіні знойдзена манета 1792 года, якая магла трапіць сюды як у канцы XVIII ст., так і пазней. У XIX ст. на былых падмурках мог быць зроблены мураваны першы паверх, але падвалы ў гэты ж час капітальна перарабілі.

б) магло быць і так, што цэглу-пальчатку выкарысталі пры пабудове радоў паўторна, пасля разборкі якой-небудзь пабудовы XVIII ст.

У гісторыі менскіх гандлёвых радоў можна выдзеліць некалькі этапаў:

1. Першапачаткова ўсе падвальныя памяшканні злучаліся шырокімі арачнымі праходамі і былі перакрытыя цыліндрычнымі скляпеннямі. Знешні мур, які выходзіў на падворак, таксама меў арачныя нішы ў сярэдзіне падвальных памяшканняў. Сляды арак і скляпенняў добра захаваліся. Адкуль былі зроблены ўваходы ў кожнае памяшканне — невядома, але магчымы яны былі з падворка, дзе на другім этапе перабудовы зрабілі праходы.

Унутраная сцяна гандлёвых радоў была цалкам складзена з цэглы-пальчаткі на вапнавай росчыне ў тэхніцы тычковай муроўкі. Усходняя сцяна з вонкавага боку абкладзена абчэсаным каменем.

Вонкавая сцяна гандлёвых радоў мае таўшчыню 1,2 м. Яна складзена ў тэхніцы мяшанай муроўкі — каменны пас чаргуецца з цагляным. Ніз падмурка залягае на глыбіні 1,8-1,9 м ад сучаснай дзённай паверхні.

2. Да другога этапу перабудовы адносіцца разборка цыліндрычных скляпенняў ва ўсіх даследаваных памяшканнях і замена іх на плоскую столь. У якасці бэлек скарыстаны чыгуначныя рэйкі — адна з іх знойдзена ў раскопе II, другая — у раскопе У. У гэты час быў значна паменшаны скразны арачны праход праз усе сутарэнні. Шырыня яго стала роўная 1,3-1,4 м. Таксама закладзены арачныя нішы і ў муры, які быў са двара і ў ім зроблены ўваходы.

3. Да трэцяга перыяду адносіцца поўная закладка праходаў з аднаго падвальнага памяшкання ў другое, а таксама выхадаў на падворак. Праходы закладзены ў адну цагліну. Тып муроўкі — адны тычкі. Але фармат цэглы такі ж, як і ў папярэдняй. Таму можна лічыць, што трэцяя перабудова адбылася неўзабаве за другой. Пісьмовыя крыніцы сведчаць аб тым, што спачатку ў 1838 г. да гандлёвых радоў былі прыбудаваны чатыры дадатковыя крамы, а потым — у пачатку 1860-х гадоў — з усходняга боку прыбудавалі яшчэ тры крамы.

Трэці будаўнічы этап звязаны з прыбудовай сцяны, знойдзенай у 1990 годзе , да ўсходняй сценкі гандлёвых радоў у сярэдзіне — другой палове XIX ст. Каб высветліць, куды ідзе сцяна, пракапалі па абодва яе бакі траншэйкі. Аказалася, што яна злучаецца з усходняй сцяной гандлёвых лавак, але перавязкі швоў з ёй не мае. Даўжыня адкапанай сцяны 3,4 м. У гэты час да паўночнага фасаду гандлёвых радоў і было прыбудавана памяшканне, цалкам ускрытае намі ў 1993 г.

4. На чацвёртым этапе быў праведзены рамонт памяшканняў, але ніякіх перабудоў не рабілася. У асноўным слабыя месцы ўмацоўваліся, а дакладней, перакладваліся з новай цэглы.

Сляды рамонту прасочваюцца ў розных месцах. Да нашых часоў дайшлі пасляваенныя здымкі гэтай часткі гандлёвых радоў. Тады яны мелі асобныя ўваходы ў кожнае памяшканне.

А вось як выглядалі раскапаныя памяшканні падвалаў гандлёвых радоў.

У першым раскопе расчышчаны даволі вялікі падвал (каля 14,4 кв.м). У плане ён амаль квадратны. У гэтым памяшканні захаваліся рэшткі цыліндрычных скляпенняў, якія перакрывалі сутарэнні гандлёвых радоў.

У другім раскопе расчышчана меншае па плошчы памяшканне (каля 13,8 кв.м). У плане яно мае выгляд няправільнага чатырохкутніка. З боку касцёла, каля падмуркаў радоў знойдзена брукоўка, складзеная з невялікіх камянёў. На адлегласці каля 1 м ад мура ў брукоўцы быў зроблены жалабок для сцёка вады. Падлога ў падвалах не заха-



*Раскопкі лета 1993 г.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

валася. Магчыма, яна была драўляная. Падлога першага паверха гандлёвых радоў была цаглянай, а зверху заліта цэментам. Рэшткі такой падлогі знойдзены ў часе раскопак.

Раскопам у 1993 г. ускрыта паўночнае заканчэнне першапачатковых гандлёвых радоў, часткі апошняга памяшкання, і поўнасцю — прыбудова XIX ст.

Унутраная плошча прыбудовы XIX ст. складае 43 кв.м. Яна мела форму трапецыі. Уваход у памяшканне быў са двара і размешчаны на адлегласці 2,4 м ад паўднёва-ўсходняга кута. Дзвярны праём добра захаваўся, яго шырыня 0,8 м. Мяркуючы па велізарным кавалкам заходняй фасаднай сцяны, ваконныя праёмы мелі выгляд паўцыркульных арак рознага памеру. Фасады былі атынкаваныя. Крытыя гандлёвыя рады былі найхутчэй бляхай, бо дахоўка сустракаецца ў адносна невялікай колькасці і, верагодна, належала да касцёла.

Сярод знаходак перыяду функцыянавання гандлёвых радоў пераважае шкляны посуд. І гэта не дзіўна, калі мець на ўвазе, што тут была размешчаная пасудная лаўка. Асартымент прадстаўлены вырабамі самымі рознымі: стопкі, шклянкі з гравіроўкай, аптэчны посуд, ваконнае шкло, фрагменты газнічак. Асабліва шмат кварт, бутэлек, слоікаў. Бутэлькі XVIII—XX стст. маюць увагнутыя донцы, гарлавіны ўсе розныя — яны рабіліся ўручную. Пэўную цікавасць уяўляюць бутэлькі з надпісамі. Напрыклад, з-пад піва завода Леккерта (канец XIX—пачатак XX ст.). Цяпер гэта завод «Беларусь», што на вуліцы М.Багдановіча. У калекцыі металічных вырабаў гэтага часу — каваныя цвікі, накладны замок на дзверы, ключ ад вялікага навяснога замка, нажы, сякера, конскія падковы, медная сталовая лыжка, жалезныя прылады да дзвярэй (ручкі, клямкі, засоўкі).

У сярэдзіне 1870-х гадоў гандлёвыя рады сталі называцца мяснымі. У пачатку XX ст. у памяшканні гандлёвых радоў знаходзіліся, акрамя мясных і каўбасных крам, малочныя і бакалейныя, а таксама магазін гатовага адзення, майстэрні краўцоў і абіўшчыкаў мэблі і пасудныя лаўкі.

На адным з архіўных планаў 1910 г. даецца падрабязная планіроўка гандлёвых радоў, дзе іх называюць «бернардиновскими давками» і паведамляецца, што іх агульная даўжыня 110, а шырыня — 14 аршын. Зараз захавалася толькі 7 больш позніх крам, якія ў значнай ступені перабудаваны. Дванаццаць больш ранніх крам былі знішчаны пасля апошняй вайны, а іх падмуркі і сутарэнні засыпаныя. У бліжэйшы час плануецца аднаўленне разбуранай часткі гандлёвых радоў і рэстаўрацыя ацалелых памяшканняў.

**Алег ТРУСАЎ**
**Ірына ГАЕЦКАЯ**

*Слуп мураванай агароджы XVII ст.*



ЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*Навіны Адраджэння*

# «МАГІЛЁЎСКАЯ ДАЎНІНА»

Вось, нарэшце, і з'явіўся на Беларусі першы абласны гісторыка–краязнаўчы часопіс «Магілёўская даўніна». Таксама першы, як калісьці музей (1867 г.) і бібліятэка (1827 г.). Ён быццам бы прадраўся праз смугу дзесяцігоддзяў рэпрэсій, забарон, бяспамяцтва, каб яшчэ раз падкрэсліць, што магутныя гісторыка–культурныя традыцыі не могуць канчаткова знікнуць нават у перыферыйным горадзе з найгоршай экалагічнай і крымінагеннай сітуацыяй, што жыхароў яго хвалююць не толькі ежа ды гарэлка.

Выпуск часопіса зацягнуўся (планаваўся на 1993 год, а першы нумар з'явіўся ў сакавіку 1994–га), што зразумела пры цяперашніх фінансавых цяжкасцях. Але, дзякуй ім, дапамаглі фундатары. Гэта Упраўленне архітэктуры і горадабудаўніцтва Магілёўскага гарвыканкама, Музей гісторыі Магілёва, Дабрачынны фонд «Адраджэнне» пры Магілёўскай арганізацыі Беларускага народнага фронта. І часопіс выйшаў у свет. У добры час! Варта адзначыць добрую вокладку, дзе густоўна стасуюцца найменне з літарамі адмысловай графікі, пячатка з выявай герба Магілёва і прыгожы лінарыт Б.Камарова — магілёўскі летапісец Трафім Сурта. Адзначым таксама даволі высокую паліграфічную якасць друку.

На крыху больш за сотню старонках часопіса невялікага фармату можна пазнаёміцца з артыкуламі на розныя тэмы дванаццаці аўтараў. Пры кожным падаецца фотаздымак аўтара і кароткая біяграфічная даведка. Зразумела, не абышлося без пэўных накладак ("першы блін"!..) Напрыклад, пад рубрыкай «Асоба ў гісторыі» змешчаны фотаздымак хлопца з магілёўскага музея, біяграфічная даведка пра яго і толькі ніжэй — назва артыкула: «Раманаў: археолаг і археограф Магілёўшчыны».

У гэтай рубрыцы яшчэ два цікавыя артыкулы: Ул.Ліўшыца «Дело N 1065", дзе раскрываюцца судовыя матэрыялы, звязаныя з арыштам і смерцю М.Гарэцкага, і артыкул Ю.Васілеўскага «Вядомы даследчык Усходняй Беларусі" — пра трагічны лёс краязнаўца, гісторыка, педагога і публіцыста Данілы Васілеўскага, рэпрэсаванага ў 1936 годзе. Сюды структурна падыходзіць нарыс «Патрыярх магілёўскага краязнаўства» пра лёс і краязнаўчую працу слыннага магілёўца Геранім Філіповіча, які больш за 30 год грунтоўна даследаваў Магілёўшчыну.

Пераказваць увесь змест першага выпуску «Магілёўскай даўніны», пэўна ж, няма патрэбы. Варта яшчэ адзначыць, што ў рэдакцыі надаюць належнае значэнне крыніцам. Гэта відаць па публікацыі «Вандровак у Масковію барона Мейерберга» ды іншых матэрыялах.

У маладога часопіса пакуль што даволі вузкае кола аўтараў, якія, за невялікім выключэннем (Васілеўскі і Ліўшыц), з'яўляюцца выкладчыкамі магілёўскіх педінстытута, педвучылішча, а таксама супрацоўнікамі музеяў. Але, нягледзячы хіба «першага бліна», мусім прызнаць, што выданне «Магілёўскай даўніны» — адметная з'ява ў жыцці не толькі магілёўчан, але і ў цэлым для культуры беларускага народа.

**ЯН МАГІЛЁВЕЦ**